православной церкви в Польше. Во-вторых, участие в соборе представителей различных национально-церковных групп способствовало бы единению всего православного населения. В-третьих, возможным было восстановление патриаршества, что в значительной степени укрепило бы положение православной церкви и сделало бы ее менее уязвимой перед государственными властями.


1. *Głogowska, H.* Białoruskie wydawnictwa religijne w II Rzeczypospolitej a białoruski ruch narodowy / H. Głogowska // Naród i religia : materiały z sesji nauk. : red. T. Stenger. – Gdańsk, 1994. – S. 137–151.

2. *Баргановіч, В. В.* Царква і дзяржава: выбраныя артыкулы і прамовы / В. В. Багдановіч ; уклад., пер. з пол. і камент. А. С. Горнага. – Мінск : Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора, 2019. – 204.

3. *Баслык, Е.* Записки священника Евстафия / Е. Баслык. – Минск : Лучи Софии, 2005. – 245 с.

4. *Лабынцев, Ю.* Литературное наследие В. В. Богдановича – белорусского сенатора II Речи Посполитой / Ю. Лабынцев // Славяноведение. – 1997. – № 3. – С. 39–49.


# ТРАНСЛЯЦЫЯ САКРАЛЬНАЙ СПАДЧЫНЫ МУЗЕЯМІ БЕЛАРУСІ (вопыт музейных практык)


***В. Ю. Себруковіч,***
*аспірант Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*


Адным з вынікаў шматвяковага досведу, без якога немагчыма ўсведамленне важнасці культурна-гістарычных працэсаў, з'яўляецца існаванне музея і тых каштоўнасцей, якія транслююцца сродкамі яго дзейнасці. Для гэтага ў музеі ажыццяўляецца экспазіцыйна-выставачная, культурна-адукацыйная, фондавая, навукова-даследчая, рэстаўрацыйная і іншыя віды дзейнасці. Помнікі гісторыі і культуры, якія знаходзяцца ў музеі, набываюць выключнае значэнне для сучаснага грамадства і гісторыі.

Невычэрпны інфармацыйны, адукацыйна-выхаваўчы патэнцыял маюць помнікі сакральнай спадчыны, якія сталі лагічным



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вынікам моцнага ўплыву хрысціянскіх традыцый на беларускіх землях, што ўвасобілася ў самых лепшых эстэтычных, мастацкіх, архітэктурных і іншых выяўленнях.

Гістарычна склалася, што акрамя хрысціянскіх канфесій (праваслаўе, каталіцызм, пратэстантызм), панаванне якіх мянялася ў пэўныя гістарычныя перыяды, уплыў на развіццё нацыянальнай культуры аказалі таксама мусульманства і іудаізм.

Прызнаючы актуальнасць і абвастрэнне праблемы захавання і трансляцыі духоўных традыцый, каштоўнасцей нацыянальнай культуры ў кантэксце працэсаў глабалізацыі, якія ахапілі ўсе сферы жыцця чалавека, ва ўмовах крызісных з'яў, палітыка-эканамічных узрушэнняў, якія не проста кранаюць, але і змяняюць культуру, варта сканцэнтраваць увагу на музеі, місія якога змяняецца адпаведна рэаліям сучаснасці. Адным з вызначальных у гэтым накірунку будзе трансляцыя сакральнай спадчыны музеямі Беларусі як увасаблення каштоўнасці традыцый, што, безумоўна, найбольш паспяхова здзяйсняецца толькі ў супрацоўніцтве музея, як сацыякультурнага інстытута, і прадстаўнікоў дзейных рэлігійных канфесій на Беларусі, сярод якіх галоўная ўвага аддаецца праваслаўю як самай распаўсюджанай рэлігіі ў нашай краіне.

Толькі шляхам канструктыўнага дыялогу і ўзаемадзеяння «Царква – Музей» можна дасягнуць мэты па засваенні чалавекам гістарычнага вопыту папярэдніх пакаленняў і духоўнага развіцця асобы.

Нездарма навукоўцамі адзначаецца галоўная тэндэнцыя сучаснага сацыякультурнага развіцця – пераход ад выкарыстання спадчыны да яе засваення, бо «засвоеная культурная спадчына садзейнічае аб'яднанню людзей любой нацыянальнасці і рэлігіі» [3, с. 309].

Несумненна, знаходжанне прадметаў сакральнай спадчыны менавіта ў музеі спрыяе іх захаванасці. Аднак для паўнавартаснага ўспрыняцця і засваення духоўных каштоўнасцей і хрысціянскіх традыцый недастаткова маўклівага знаходжання артэфактаў культуры ў экспазіцыі. У гэтым плане, маючы каштоўны матэрыял, багаты інфармацыйны патэнцыял, музеі павінны стаць рухавіком працэсу па далучэнні грамадства, асабліва дзяцей і падлеткаў, да духоўнасці. У наш час помнікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сакральнай спадчыны захоўваюцца ў многіх беларускіх музеях: Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, музеі гісторыі старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі, музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Веткаўскім музеі стараабраднiцтва i беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава, Іўеўскім музеі нацыянальных культур, Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку, Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі і інш.

Сярод іншых вылучаецца Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі – адзіны ў краіне дзяржаўны музей гістарычнага профілю, які асвятляе працэсы развіцця вераванняў і іх уплыў на фарміраванне культуры. У сваёй працы музей перш за ўсё кіруецца асноўнай канцэпцыяй: знаёмства з гісторыяй і культурай народаў, якія жывуць у Беларусі, выхаванне культуры талерантнасці да прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей і канфесій [5]. Таксама робіць акцэнт на працу з дзецьмі і падлеткамі.

Зразумела, што музейныя практыкі, якія здзяйсняюцца на базе дадзенай установы, так ці інакш звязаны з рэлігійнай тэматыкай, якая чырвонай ніткай праходзіць у тэматычнай структуры экскурсій, музейных заняткаў, лекцый. Сярод іх такія лекцыйныя заняткі, як «Сімволіка храма», «Сімволіка іконы», «Святыя заступнікі ў праваслаўным іканапісе і жыційнай літаратуры», «Хрысціянскія святыні на Беларусі» і інш. Выкарыстанне аўтэнтычных прадметаў з магутнай энергетыкай стварае спрыяльную атмасферу да ўспрыняцця інфармацыі і моцнага эмацыйнага ўздзеяння. Вельмі карыснай з’яўляецца распрацаваная пешаходная экскурсія «Музыка, застыўшая в камне», падчас якой можна не толькі пазнаёміцца з гістарычнымі месцамі г. Гродна, але і з помнікамі культавай архітэктуры, сярод якіх і перліна гродзенскай школы дойлідства Свята-Барысаглебская (Каложская) царква XII ст.

Перспектыўным накірункам у дзейнасці музея, асабліва памежнага рэгіёна, з’уляецца ўдзел у міжнародных праектах. Так, у рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія – Літва – Беларусь у межах еўрапейскага інструмента суседства на 2014–2020 гг. створаны праект міжнароднай тэхніч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най падтрымкі «Культурная спадчына па абодва бакі мяжы». У межах дадзенага праекта 18 красавіка 2019 г. адбылося адкрыццё выстаўкі «Велікоднае сугучча. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва беларуска-літоўскага памежжа». На выстаўцы былі паказаны творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, выкананыя ў традыцыйных тэхніках, характэрных для памежных рэгіёнаў, праведзены майстар-класы па размалёўцы «пісанак» у выкананні народных майстроў Беларусі і Літвы, а таксама велікодныя гульні і забавы [7]. Такія праекты даюць магчымасць не толькі пазнаёміцца з культурнымі традыцыямі суседняга рэгіёна, але і глыбей спазнаць свае лакальныя асаблівасці духоўнай культуры.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей таксама валодае каштоўнымі калекцыямі сакральнага мастацтва ў сваім зборы, на аснове якіх ладзіцца экспазіцыйна-выставачная (частка пастаяннай экспазіцыі «Сакральнае мастацтва»), рэстаўрацыйная і культурна-адукацыйная дзейнасць. Праводзяцца тэматычныя экскурсіі («Ікона не карціна»), музейныя заняткі («Храм над Нёманам»). Цікавай формай далучэння да сакральнай спадчыны сваёй краіны падаецца ажыццяўленне лялечных паказаў музейнай батлейкай, якая пачала дзейнічаць у 2010 г. Вельмі важна, што праца з дзецьмі вядзецца пачынаючы з дашкольнага ўзросту. У аснову лялечных паказаў пакладзены гістарычныя («Пажар у замку Вітаўта», «Легенда Святога Губерта») і рэлігійныя сюжэты, звязаныя з нараджэннем і ўваскрэсеннем Ісуса Хрыста («Раство Хрыстова», «Велікодны цуд»). Самому паказу папярэднічае кароткі экскурс у гісторыю ўзнікнення батлейкі і свята.

Знакавай падзеяй стала адкрыццё выстаўкі «Сакральная спадчына Панямоння», якое адбылося 21 лістапада 2018 г. Выстаўка створана на падставе фондавых калекцый Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, калекцый музея гродзенскага брыгіцкага кляштара і кляштара Кангрэгацыі Святога Сямейства з Назарэта, Свята-Пакроўскага кафедральнага сабора, прыватных збораў. Напярэдадні адкрыцця адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя з аднайменнай назвай, на якой польскія, літоўскія і беларускія наву-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

коўцы, прадстаўнікі мясцовага духавенства абмеркавалі пытанні лакалізацыі страчаных цэркваў і касцёлаў, атрыбуцыі, захавання і рэстаўрацыі мастацкіх і пісьмовых помнікаў [8].

Яшчэ адзін прыклад рэалізацыі рэзананснага выставачнага праекта – адкрыццё міжнароднай выстаўкі «Беларусь і Біблія», якая працавала з 20 верасня да 21 кастрычніка 2018 г. у музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Унікальныя экспанаты, сабраныя ў адным месцы з 11 дзяржаўных і прыватных калекцый розных краін свету, з'явіліся адлюстраваннем гісторыі стварэння, перадачы і захавання Бібліі і паказалі яе ўплыў на развіццё чалавецтва ўвогуле і асобы ў прыватнасці. Узрост некаторых асобнікаў дасягае 5 тысяч гадоў. Адзначым, што дадзены ўнікальны праект набыў комплексны характар, у межах якога адбываліся навуковыя дыскусіі, праводзіліся майстар-класы, у музеі кнігі для дзяцей прайшлі музейныя заняткі [2].

Вельмі важным і неадлучным элементам у дзейнасці музея па захаванні і трансляцыі сакральнай спадчыны з'яўляецца належны ўзровень умоў дзеля захавання прадметаў і правядзення рэстаўрацыйных работ. Вынікам шматгадовай карпатлівай працы рэстаўратараў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь стала правядзенне выстаўкі «Адкрыццё сапраўднага», прымеркаванай да 80-гадовага юбілею музея (адкрыццё выставы адбылося 25 студзеня 2019 г.). У пяці залах размясціліся творы жывапісу і іканапісу, скульптуры, прадметы дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, якія раскрыліся наведнікам з новага гледзішча: праз розныя этапы работ па ўзнаўленні помніка, з аднаго боку, паказаны прафесійны падыход да аднаўлення твора, з другога – наведнік нібы прыадчыняе таямніцу пераўтварэння прадмета праз наданне яму новага жыцця менавіта ў музейнай прасторы.

Папулярызацыя твораў сакральнага мастацтва паспяхова ажыццяўляецца шляхам міжнародных выставачных праектаў у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, які мае самы вялікі збор у Беларусі і найбольш каштоўныя ў краіне калекцыі старажытнабеларускага іканапісу і сакральнага жывапісу [6]. Прыкладам такіх праектаў несумненна можна назваць выставу з больш за 30 твораў беларускага іканапісу XVII–XIX стст.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія ўпершыню былі прэзентаваны ў Нацыянальным музеі Ліхтэнштэйна [9].

Вызначаецца таксама ўнікальнасцю сваіх калекцый і арганізацыяй працы Веткаўскі музей стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава, які транслюе артэфакты культуры, іх адметнасць у кантэксце перапляцення лакальных і канфесійных традыцый. У фондах музея – унікальныя калекцыі стараабрадніцкіх, беларускіх народных ікон, літых ікон, крыжоў і інш. На гэты час сабраны багаты фальклорна-этнаграфічны матэрыял-даследаванне духоўнай культуры Веткі і Палескага рэгіёна, а дакладней – традыцый стараабрадніцтва.

Трансляцыя сакральнай спадчыны і самабытных традыцый Веткі адлюстроўваецца ў грунтоўнай навукова-даследчай працы, вынікам якой сталі шэраг публікацый супрацоўнікаў («…Дзе нарадзіліся і выхаваны жыць па-Божы…»: з вопыту этнакультурнага выхавання, «Гасподні празнік», «Божая адзёжка», аб уплыве кананічных тэкстаў на народнае хрысціянства (паводле абраду «Свяча») і выданні музея («Ветковская икона», «Живая вера. Ветка», «Книжная культура. Ветка» і інш.) [1].

Вядзецца актыўная культурна-адукацыйная і выставачная дзейнасць менавіта ў супрацоўніцтве з царкоўнымі ўстановамі. Так, 28 снежня 2018 г. у філіяле музея ў Гомелі адбылося адкрыццё выставачнага праекта «Ікона звалась Свячой...», дзе выстаўлены тэксты, запісаныя супрацоўнікамі музея ў шматлікіх экспедыцыях па Гомельшчыне, а таксама суседняй Браншчыне, экспанаты паўсталі ў выглядзе своеасаблівых вобразных, тэматычных комплексаў-інсталяцый. Так, у выставачнай зале можна пабачыць аўтэнтычныя і рэканструяваныя тыпы Свечаў, якія існавалі і існуюць зараз на Гомельшчыне, традыцыйны народны іканапіс і традыцыйнае ткацтва. На выставе ёсць экспанаты з фондаў Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава, царкоўна-гістарычнага музея Беларускай праваслаўнай царквы пры Мінскай духоўнай акадэміі, Гомельскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На выставе – амаль два дзясяткі народных ікон канца XVIII – пачатку XX ст., больш чым паўсотні ручнікоў канца XIX – сярэдзіны XX ст., дванаццаць комплексаў аўтэнтычных і рэканструяваных Свеч, а таксама экспедыцыйныя фотаздымкі абраду, сшыткі з рукапісамі псальмаў і фальклорныя тэксты, звязаныя з рытуальнымі момантамі і дзеямі [4].

Прааналізаваўшы дзейнасць беларускіх музеяў як зварот да хрысціянскіх каштоўнасцей і традыцый за апошні час, трэба адзначыць пазітыўныя моманты разнастайнасці формаў іх дзейнасці ў працэсе трансляцыі сакральнай спадчыны, прычым як сталічных, так і музеяў абласнога, раённага падпарадкавання.

Такім чынам, у рабоце музеяў Беларусі па трансляцыі сакральнай спадчыны акрэслены наступныя тэндэнцыі.

1. Ажыццяўленне на пастаяннай аснове формаў культурна-адукацыйнай дзейнасці па далучэнні дзяцей і падлеткаў да хрысціянскіх каштоўнасцей (музейныя заняткі, майстар-класы, сустрэчы са святарамі, вечары духоўнай музыкі).

2. Рэалізацыя супольна з іншымі музеямі краіны і замежжа міжнародных выставачных праектаў.

3. Рэалізацыя мерапрыемстваў і выставачных праектаў супольна з рэлігійнымі арганізацыямі.

Ва ўмовах імклівых змен у грамадскім і культурным жыцці музей стаў тым трывалым асяродкам, які выконвае задачу міжкультурнага і міжэтнічнага ўзаемадзеяння, каштоўнаснага дыялогу ў грамадстве. Разам з гэтым музей пакліканы захоўваць той магутны падмурак хрысціянскіх традыцыйных каштоўнасцей, на аснове якіх стагоддзямі фарміравалася нацыянальная беларуская культура.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1.* Аб музеі. Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://vetka-museum.by/ab-muzei/vydanni-muzeya.html. – Дата доступу: 18.04.2019.

*2.* Беларусь и Библия – уникальная выставка открылась в Национальной библиотеке Беларуси! // Нац. б-ка Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.nlb.by/content/news/national-library-of-belarus/belarus-i-bibliya-unikalnaya-vystavka-otkrylas-v-natsio-nalnoy-biblioteke-belarusi/. – Дата доступа: 19.04.2019.

3. *Буров, Н. В.* Проблемы музеефикации культовых сооружений. Сохранение нематериального культурного наследия для формирования духовного мира человечества / Н. В. Буров // Глобальный мир : системные сдвиги, вызовы и контуры будущего : XVII Междунар. Лихачевские науч. чтения, 18–20 мая 2017 г. / Рос. акад. наук, Конгр. петерб. интеллигенции, С.-Петерб. гуманитар. ун-т профсоюзов. – СПб., 2017. – С. 309–312.

*4.* Выставы [Электронны рэсурс] // Веткаўскі музей стараабраднiцтва i беларускiх традыцый iмя Ф. Р. Шклярава. – Рэжым доступу: http://vetka-museum.by/vystavy/dzeyuchyya/515-vystava-ikona-zvalas-svyachoj.html. – Дата доступу: 19.04.2019.

*5.* Гродзенскi дзяржаўны музей гiсторыi рэлiгii [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://religija.museum.by/be. – Дата доступу: 21.04.2019.

6. Древнебелорусское искусство [Электронный ресурс] // Нац. мастацкі музей Рэсп. Беларусь. – Рэжым доступу: https://www.artmuseum.by/ru/ koll/dbisk.html. – Дата доступу: 18.04.2019.

*7.* Навуковая канферэнцыя «Сакральная спадчына Панямоння» [Электронны рэсурс] // Гродзенскi дзяржаўны гiсторыка-археалагiчны музей. – Рэжым доступу: https://museum-grodno.by/be/event/navukovaya-kanferentsyya-sakralnaya-spadchyna-panyamonnya. – Дата доступу: 18.04.2019.

*8.* Праграма выстаўкi «Велiкоднае сугучча. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва беларуска-лiтоўскага памежжа» [Электронны рэсурс] // Гродзенскi дзяржаўны музей гiсторыi рэлiгii. – Рэжым доступу: http://muzej.by/?p=2119&lang=be. – Дата доступу: 21.04.2019.

*9. Салимова, З.* Белорусские иконы в Вадуце [Электронный ресурс] / З. Салимова // Наша Газета. – Режим доступа: http://nashagazeta.ch/news/culture/belorusskieikonyvvaduce?fbclid=IwAR15PCcuwjUlFdUYD8lnadpApNs0NizyABpEmRCwLPdN_XTbaEWGOZ6s00. – Дата доступа: 18.04.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ